ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
22
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 3 (1303)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### ТВОРЧЫ СЕМІНАР

прафесарска - выкладчыцкага саставу гістарычнага факультэта «Тэарэтычныя праблемы гістарычнай навукі на сучасным этапе» існуе на факультэце ўжо не першы год. Чарговае пасяджэнне яго прысвячалася тэме «Сацыяльна - эканамічныя праблемы павышэння жыццёвага ўзроўню працоўных у святле прадстаячага XXVI з'езда КПСС». З дакладам выступіў загадчык кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў М. І. Базылёў.

М. ЛАХВІЧ.

### ПАЧАЛА РАБОТУ

універсітэцкая прыёмная камісія па правядзенню набору студэнтаў на І курс у 1981 годзе. Акрамя арганізацыйных мерапрыемстваў распрацаваны чатыры маршруты выездаў агітбрыгад супрацоўнікаў усіх факультэтаў для правядзення гутарак з сельскай і рабочай моладдзю, ваеннаслужачымі, выпускнікамі школ.

Упершыню ў рабоце прыёмнай камісіі прымяняюцца такія новыя формы, як размеркаванне раёнаў БССР і школ Мінска паміж факультэтамі і універсітэцкімі кафедрамі для правядзення прафарыентацыі; уключэнне 75—80 працэнтаў студэнтаў усіх форм навучання ў прафарыентацыйную работу.

В. СЛАВІНСКІ.

### НА ПАСЯДЖЭННЯХ

камітэта камсамола і партыйнага бюро фізфака зацверджаны кандыдатуры камандзіраў і камісараў факультэцкіх СБА. Сярод тых, хто летам гэтага года ўзначаліць работу на студэнцкіх будоўлях, — камандзіры з вялікім стажам, такія, як М. Салановіч, В. Якель, У. Жук. Тыя ж, хто амаль не мае будатрадаўскага вопыту, маюць магчымасць хутка набыць яго — у Пскоўскай вобласці ў час зімовых канікулаў будзе працаваць зімовы будатрад студэнтаў-фізікаў.

І. НІЧЫПАР,
начальнік штаба працоўных спраў фізфака.

### АКТЫЎНУЮ ДАПАМОГУ

рэспубліканскаму аргкамітэту па правядзенню сярод школьнікаў Беларусі алімпіяд па фізіцы, хіміі, матэматыцы аказалі супрацоўнікі БДУ. У першай палове студзеня ва ўсе абласныя цэнтры рэспублікі былі камандзіраваны 15 выкладчыкаў з фізфака, хімфака, мехмата і ФПМ, якія ў час правядзення школьных алімпіяд выявілі найбольш падрыхтаваных школьнікаў і арыентавалі іх на паступленне ў БДУ.

Т. САХАШЧЫК.

# Радзіме—наша праца, натхненне!

**АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЕКТ ЦК КПСС ДА XXVI З'ЕЗДА ПАРТЫІ «АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ЭКАНАМІЧНАГА І САЦЫЯЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ СССР НА 1981—1985 ГАДЫ І НА ПЕРЫЯД ДА 1990 ГОДА»**

## СПАЗНАВАЦЬ ГЛЫБІНІ ТЭОРЫІ

У ПРАЕКЦЕ ЦК КПСС да XXVI з'езда КПСС у раздзеле «Развіццё навукі і паскарэнне тэхнічнага прагрэсу» прадугледжана развіццё матэматычнай тэорыі і павышэнне эфектыўнасці яе выкарыстання ў прыкладных мэтах. Больш падрабязна гэта абазначае неабходнасць далейшага развіцця фундаментальных даследаванняў у галіне матэматыкі і ў першую чаргу тых яе напрамкаў, вынікі якіх прымяняюцца непасрэдна для развіцця фізічных, тэхнічных і іншых сумежных навук. Задача гэта ставіцца перад усімі навуковымі калектывамі, дзе праводзяцца даследаванні ў галіне матэматыкі ці яе прыкладанняў.

Матэматычнымі даследаваннямі ў нашым універсітэце займаюцца ўсе матэматычныя кафедры мехмата і ФПМ, а таксама кафедра вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі на фізфаку і вылічальны цэнтр БДУ.

На механіка-матэматычным факультэце вядуцца ў асноўным фундаментальныя даследаванні па алгебры, матэматычнаму аналізу, геаметрыі і тапалогіі, дыферэнцыяльных ураўненнях і г. д. Факультэт мае значны навуковы патэнцыял, супрацоўнікі валодаюць запасам навуковых ідэй для расшырэння фундаментальных даследаванняў і ўмацавання іх сувязей з практыкай.

Што датычыць навуковых даследаванняў непасрэдна кафедры тэорыі функцый, дык яны вядуцца ў галіне тэорыі функцый комплекснага пераменнага і яе прыкладанняў. А гэта важны ў тэарэтычных і прыкладных адносінах раздзел матэматычнага аналізу. Акрамя таго, у сувязі з неабходнасцю ўдасканалення вучэбнага працэсу мы распрацоўваем практычныя пытанні методыкі выкладання матэматыкі ў ВНУ, што патрабуе пераважна фундаментальных даследаванняў.

Задачы ў галіне развіцця матэматыкі, пастаўленыя ў праекце «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года», поўнасцю адносяцца да калектыву нашай кафедры, і мы маем усе магчымасці справіцца з імі паспяхова.

Э. ЗВЯРОВІЧ,
загадчык кафедры тэорыі функцый.

**«РАСШЫРАЦЬ І ЎДАСКАНАЛЬВАЦЬ ЭКАНАМІЧНЫЯ, НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫЯ І КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ З ЗАРУБЕЖНЫМІ ДЗЯРЖАВАМІ...»**

*(З праекта ЦК КПСС да XXVI з'езда КПСС).*



НА ЗДЫМКУ: аспірант кафедры арганічнай хіміі Нахар ПРАДЗІП (Індыя) праводзіць доследы.

Фота У. Будая.

Выступленне Нахара Прадзіпа чытайце на 3-й стар.

## Зацікаўлены ўсе

КОЖНЫ шосты студэнт фізфака падзяліўся сваімі думкамі аб праекце ЦК КПСС да XXVI з'езда КПСС на групавых сходах, прысвечаных абмеркаванню гэтага гістарычнага дакумента. Удзельнікамі студэнцкіх сходаў сталі выкладчыкі грамадскіх дысцыплін, якія выступілі з агульным аглядам праекта «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года» і кваліфікавана адказалі на пытанні ўдзельнікаў абмеркавання.

Студэнты ўсіх груп падрыхтавалі змястоўныя выступленні па кожнаму з XII раздзелаў праекта ЦК КПСС і ўнеслі ў час яго абмеркавання больш за 30 прапаноў і заўваг аб сацыяльным развіцці і павышэнні народнага дабрабыту, развіцці навукі і паскарэнні тэхнічнага прагрэсу, ахове прыроды.

Найбольш цікава і актыўна прайшлі сходы ў чацвёртакурснікаў кафедры фізікі цвёрдага цела (камсорг Іосіф Шумскі) і ў другакурснікаў 3-га патоку (камсорг Алена Барысава).

Вынікі абмеркавання праекта ЦК КПСС да XXVI з'езда КПСС былі падведзены на партыйным сходзе камуністаў факультэта і на пасяджэнні партыйнага бюро.

У. АДЖАЕЎ,
сакратар камітэта камсамола фізфака.

● ТОЛЬКІ ФАКТ

# КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА «ІСКРЫ»

НЯДАЎНА на факультэце журналістыкі прайшла навукова-практычная канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага саставу, прысвечаная 80-годдзю з дня выхаду ў свет першага нумара бальшавіцкай газеты «Іскра». У яе рабоце прынялі ўдзел спецыялісты розных галін ведаў: гісторыі, мовазнаўства, тэорыі і практыкі журналістыкі, стылістыкі. Гэта дазволіла весці размову усебакова, у розных ракурсах асвятліць ролю і значэнне ленінскай «Іскры» ў развіцці бальшавіцкага друку.

У дакладах, з якімі выступілі загадчык кафедры гісторыі журналістыкі, доктар гістарычных навук, прафесар Р. В. Булацкі, кандыдаты гістарычных навук, дацэнты С. В. Говін і А. Г. Слука, быў дадзены глыбокі аналіз рэдактарскай дзейнасці У. І. Леніна — заснавальніка «Іскры», а таксама месца і ролі газеты ў гісторыі партыйна-савецкага друку, зроблены агляд літаратуры па данаму пытанню.

Аб ленінскіх традыцыях у развіцці жанру інтэрв'ю паведаміў прысутным загадчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, доктар філалагічных навук, прафесар Б. В. Стральцоў. «Стыль артыкулаў У. І. Леніна ў «Іскры» — так называўся даклад, які быў прадстаўлены ўдзельнікам канферэнцыі загадчыкам кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, доктарам філалагічных навук, прафесарам М. Я. Цікоцкім. Лінгвістычны аналіз ленінскіх артыкулаў быў праілюстраваны шматлікімі прыкладамі.

У рабоце канферэнцыі прыняў удзел доктар гістарычных навук, прафесар Д. П. Жмуроўскі. Яго выступленне аб ролі ленінскай «Іскры» ў фарміраванні штаба прафесійных рэвалюцыянераў вызначалася ідэйна-палітычнай глыбінёй, веданнем гістарычных аспектаў мінулага і сучаснасці.

А. КОНАНАВА.

# УНІВЕРСІТЭЦКАМУ ДЫПЛОМУ — ГАРАНТЫЮ ЯКАСЦІ

СЕСІЯ

## Тваю залікоўку, студэнт!

**Гэтая размова са студэнтамі першага курса хімічнага факультэта адбылася ў мяне напярэдадні іх першай у жыцці сесіі.**

— Калі паступала на хімфак, — гаворыць Таня Балвановіч, — думала, што ведаю хімію «ад» і «да», але амаль адразу выявіла незнаёмыя раней тэорыі.

А Надзя Жукава дадае:

— Ды і ўяўленне аб хіміі наогул як аб навуцы цяпер ужо іншае. Тое, што раней здавалася зусім простым, на самай справе значна складаней. І не так усё лёгка і зразумела...

Але, толькі прайшоўшы праз вучэбны семестр, Юра Лычкоўскі зразумеў, што ён займаецца любімай справай і яму цікава, Таня Балвановіч адчула радасць пазнання невядомага, а Надзя Жукава ўстанавіла канчаткова: «Хімія — маё прызванне».

Чаму паспелі навучыцца за свой першы семестр першакурснікі-хімікі?

— Дыферэнцыраваць складаныя функцыі, шукаць нармалі, «прабіваць» радыёапаратуру для дыскатэкі, бегчы з пустым страўнікам на лекцыі, калі праспіш першую пару,— жартуе Юра Пагарцаў.

...Яшчэ зусім нядаўна сесія здавалася далёкай. А цяпер...

— Да экзаменаў рыхтуюся з поўнай адказнасцю, каб раптам не паявіліся «хвасты» і не было троек,— гаворыць Таня Балвановіч.

— Што б вы паставілі самі сабе за работу ў першым семестры, за падрыхтоўку да сесіі? — задаю пытанне.

— «Залік», вядома, — адказвае за ўсіх Юра Лычкоўскі.

Пакуль што першакурснікі хімфака адзначылі на карце сваіх ведаў белыя плямы яшчэ не пазнанага, зразумелі, што вучыцца ў поўным сэнсе гэтага слова, вучыцца па-сапраўднаму — не так проста. Вучоба загартоўвае характар, выхоўвае сілу волі. І напэўна таму студэнцкая залікоўка для кожнага не толькі дакумент, дзе выстаўляюцца ацэнкі ведаў і паспяховасці студэнтаў. Яна — адлюстраванне нашых характараў, волі, настойлівасці, імкнення да высокай мэты.

**А. ЛЫСЮК,**
**студэнтка І курса факультэта журналістыкі.**




**НА ЗДЫМКАХ: на гістфаку сесія—студэнт 4-га курса гістарычнага факультэта Сяргей Бароўскі здаў экзамен па педагогіцы на выдатна.**

Фота **М. Дубовіка.**



ПРАКТЫКА

## ПЛЁННЫЯ КАНТАКТЫ

МНЕ ХОЧАЦЦА падзяліцца некаторымі ўражаннямі аб 6-й школе горада Мінска і расказаць пра асобныя мерапрыемствы, якія праводзілі студэнты-практыканты БДУ ў замацаваных класах.

Наша практыкантка Л. Буцалева прыняла самы актыўны ўдзел у правядзенні захапляючага піянерскага збору на тэму «Піянер і прырода». На гэтым зборы вучні прадэманстравалі шэраг кветкавых раслін, якія яны вырошчваюць у школе. Прыемна было пазнаёміцца і з вучнёўскімі малюнкамі, мастацкімі вырабамі. На зборы пастаянна гучаў заклік «Любіце прыроду!». Шмат цікавых фактаў прывёў у сваім выступленні перад піянерамі ветэран Вялікай Айчыннай вайны, лектар Рэспубліканскага таварыства «Веды» Ю. В. Банчкоўскі. Слухаючы выступленне спецыяліста-біёлага, нам думалася, як своечасова праводзіцца гэты збор, калі ўся краіна абмяркоўвае праект ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года». А ў гэтым дакуменце ёсць спецыяльны раздзел, прысвечаны ахове прыроды.

Цікава ў школе прайшлі сустрэчы з доктарам філалагічных навук, прафесарам кафедры беларускай літаратуры С. Х. Александровічам і дацэнтам гэтай кафедры У. А. Навумовічам, з навуковым супрацоўнікам інстытута педагогікі З. І. Пракоф'евай, якія прысутнічалі на ўроках беларускай літаратуры ў нашых студэнтак Аліны Будзько і Любові Буцалевай. Усе яны ацанілі ўрокі самай высокай адзнакай, бо практыканткі праявілі максімум старання, выклікалі ў вучняў зацікаўленасць да прадмета, выкарыстоўвалі шмат наглядных дапаможнікаў, грампласцінкі.

Пасля абмеркавання ўрокаў перад вучнямі 8-х класаў выступілі прафесар С. Х. Александровіч і навуковы супрацоўнік інстытута педагогікі З. І. Пракоф'ева, а перад вучнямі 5-х класаў — дацэнт У. А. Навумовіч. Такое «размеркаванне» па класах было невыпадковым. Вядомы вучоны С. Х. Александровіч доўгі час займаецца даследаваннямі многіх гістарычных пытанняў у беларускім літаратуразнаўстве, а таксама збірае і вывучае цікавыя біяграфічныя звесткі пра беларускіх пісьменнікаў, у тым ліку і пра народных песняроў Я. Купалу і Я. Коласа, якім у 1982 годзе спаўняецца 100 год з дня нараджэння. На ўроку ў васьмікласнікаў прагучаў голас Я. Коласа, госць паказаў першую купалаўскую кніжку «Жалейку», брашуру першага беларускага выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца» і «шматпакутны» (як сказаў сам выступаючы) часопіс «Наша ніва» за 1910 год. Гэты часопіс дапамог развіць творчыя сілы народным песнярам. Сцяпан Хусейнавіч расказаў аб рабоце над аповесцямі пра Я. Коласа.

Выступленне дацэнта У. А. Навумовіча перад пяцікласнікамі было звязана з вывучэннем творчасці М. Лынькова. Уладзімір Аляксандравіч, які не раз сустракаўся з пісьменнікам, паказаў вучням лісты, напісаныя уборыстым, роўным почыркам М. Лынькова. Вучні да ўрока зрабілі цікавыя малюнкі па аповесці «Міколка-паравоз».

Усю арганізацыйную работу на гэтых уроках праводзіў наш кіраўнік В. В. Каладзінскі разам з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры. Выступленні паважаных гасцей былі запісаны на відэаплёнку, якая дэманстравалася на студэнцкай канферэнцыі.

Можна было б яшчэ шмат расказаць і аб іншых добрых справах, якія робяць студэнты-практыканты, прафесарска-выкладчыцкі калектыў кафедры беларускай мовы і літаратуры БДУ імя У. І. Леніна не толькі ў гэтай школе, але і ў многіх іншых. Хочацца ўспомніць толькі нядаўняе выступленне па рэспубліканскаму радыё студэнткі 5-га курса Вольгі Русілкі, якая праходзіла практыку ў гэтай жа школе. Шмат цікавых мерапрыемстваў правяла яна з вучнямі старэйшых класаў. Сярод іх—цікавая гутарка аб праблеме ўзаемаадносін маладога настаўніка з класам.

Праблема ўзаемаадносін прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў, студэнтаў-практыкантаў і вучняў вельмі складаная. І вырашаць яе трэба праз больш частыя сустрэчы-дыскусіі, бо вельмі прыемна і радасна бывае на душы, калі ты бачыш у школе сваіх настаўнікаў — вядучых спецыялістаў ВНУ, і выступаеш у ролі настаўніка, вядзеш сам урок, ацэньваеш веды вучняў, а прафесары, дацэнты ацэньваюць твае веды, твае здольнасці. Такі ўзаемаабмен ведамі і думкамі на практыцы дае значна больш, чым некаторыя лекцыі па педагогіцы або прадмету. Мне здаецца, што ёсць неабходнасць у нас ва універсітэце шырэй умацоўваць сувязь навучання з вучэбна-выхаваўчай і метадычнай работай у школе, каб мы ўжо з першага курса знаёміліся з будучай работай настаўнікаў, маглі часцей бываць у школе.

**Л. АНЦІЛЕЎСКАЯ,**
**студэнтка IV курса аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры.**

# ВЕКТАР ПОШУКУ

ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ

Аб перадз'ездаўскай вахце калектыву кафедры аналітычнай хіміі я папрасіла расказаць загадчыка кафедры, члена-карэспандэнта АН БССР, заслужанага дзеяча навукі БССР, доктара хімічных навук, прафесара Рыгора Лазаравіча Старобінца.

**— Якія стаяць задачы перад кафедрай і як яны адлюстроўваюцца ў сацыялістычных абавязацельствах калектыву?**

— Кафедра аналітычнай хіміі мае дзве мэты. Першая заключаецца ў навучанні студэнтаў хімічнага, біялагічнага і геаграфічнага факультэтаў універсітэта агульнаму курсу «аналітычная хімія» і падрыхтоўцы студэнтаў старэйшых курсаў хімфака па спецыяльнасці «аналітычная хімія». Другая — даследаванне і распрацоўка высокаэфектыўных экстракцыйных храматаграфічных метадаў раздзялення, ачысткі і канцэнтравання рэчываў, а таксама ўкараненне распрацаваных метадаў у народную гаспадарку.

У сувязі з гэтымі напрамкамі сацыялістычныя абавязацельствы прымаюцца па наступных раздзелах: вучэбна-метадычная, палітыка-выхаваўчая, навукова-даследчая работа, прапаганда навукова-палітычных ведаў і ўдзел у грамадскім жыцці.

**— Рыгор Лазаравіч, што прадугледжана ў плане ўдасканалення вучэбна-метадычнай работы і як выконваюцца ўзятыя абавязацельствы?**

— У мінулым годзе былі падрыхтаваны вучэбныя праграмы па агульных і спецыяльных курсах. Нанава распрацаваны такія праграмы, як «Аналіз і ачыстка прамысловых выкідаў» (кіраўнік курса дацэнт С. Ф. Петрашкевіч) і «Метады аналітычнага кантролю гальванічных пакрыццяў», якую падрыхтаваў дацэнт Я. М. Рахманько. Гэта максімальна наблізіць спецыялізацыю «аналітычная хімія» да патрабаванняў сучаснай вытворчасці.

Для студэнтаў 5-га курса выдадзены дапаможнік «Хімічны аналіз. Асновы метадаў раздзялення і канцэнтравання рэчываў». Падрыхтавала яго прафесар В. Р. Скараход.

**— Раскажыце, калі ласка, аб тым, якіх вынікаў дасягнула кафедра ў галіне навуковых даследаванняў?**

— Супрацоўнікі кафедры вядуць распрацоўку іёнаабменных, сарбцыйных і экстракцыйных метадаў раздзялення, ачысткі і канцэнтравання рэчываў. У гэтым годзе падрыхтаваны і абаронены дзве кандыдацкія дысертацыі па гэтай тэматыцы, апублікавана 26 навуковых артыкулаў. На прадпрыемствах каляровай металургіі СССР укаранёны стандартныя ўзоры сплаваў каляровых металаў, у атэстацыйным аналізе якіх прымала ўдзел наша кафедра. Гэта распрацоўка дае эканамічны эфект у размеры 4 рублёў на 1 рубель затрат. У лабараторыях інстытута «Аўтарампрампраект» укаранёна методыка вызначэння цынку ў сцёкавых водах аўтамабільнай прамысловасці і методыка вызначэння жалеза і нафтапрадуктаў у асабліва стойкіх эмульсіях. Акрамя таго, членамі кафедры пададзена 9 заявак на аўтарскія пасведчанні і ўжо атрыманы 2 станоўчыя рашэнні.

Актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце кафедры прымаюць студэнты. На аснове іх сумесных работ з выкладчыкамі кафедры было апублікавана ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх часопісах 8 навуковых артыкулаў, сярод якіх найбольш значныя работы студэнткі А. Пірожнікавай «Вадкі іёнаселектыўны электрод для вызначэння сульфатаў» і студэнтаў В. Суднік і М. Трафіменкі «Экстракцыйна-фотаметрычнае вызначэнне вісмуту ў вадзе». Абедзве работы апублікаваны ва ўсесаюзным часопісе «Аналітычная хімія». Удзельнікі навуковага гуртка пры кафедры (кіраўнік — дацэнт Р. К. Гручанкоў) выступілі з 14 дакладамі на студэнцкай навуковай канферэнцыі універсітэта. А студэнтка С. Рагацюк удзельнічала ў рабоце ўсесаюзнай канферэнцыі.

**— Якія распрацаваны мерапрыемствы па дастойнай сустрэчы XXVI з'езда КПСС?**

— На пасяджэнні кафедры мы запланавалі падрыхтаваць да абароны адну дысертацыю, падаць 5 заявак на атрыманне аўтарскіх пасведчанняў, дадаткова падрыхтаваць і здаць у друк 6 навуковых артыкулаў.

**Інтэрв'ю правяла**
**А. БЕРАСНЕВА,**
**студэнтка ІІ курса факультэта журналістыкі.**

БДУ 60 год

**ПАД ЗНАКАМ ДАЛЕЙШАГА ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ, РОСТУ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ, АКТЫВІЗАЦЫІ РАБОТЫ ПА КАМУНІСТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ ІДЗЕ ПАДРЫХТОЎКА ПА ДАСТОЙНАЙ СУСТРЭЧЫ 60-ГОДДЗЯ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

**60 ГОД. 60 ПРЫСТУПАК УВЕРХ. ВЫШЫНЯ, АДКУЛЬ ДОБРА БАЧНЫ ПРОЙДЗЕНЫ ШЛЯХ. БЫЎ ЁН ЦЯЖКІ... АЛЕ Ж ЛЁГКІХ ДАРОГ НЕ БЫВАЕ. І, ВІДАЦЬ, ЧЫМ ЦЯЖЭЙ ШЛЯХ, ТЫМ БОЛЬШ ГОНАРУ ЗА ТОЕ, ШТО ПРОЙДЗЕНЫ ЁН ДАСТОЙНА.**

**АЗІРНЁМСЯ НА ШЛЯХ ПРОЙДЗЕНЫ. ПРАПАНУЕМ ПЕРШЫ МАТЭРЫЯЛ З НАРЫСАЎ ГІСТОРЫІ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ БДУ. ІХ РЫХТАВАЛІ БЫЛЫЯ САКРАТАРЫ КАМІТЭТА КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА.**

# З БУРЫ РЭВАЛЮЦЫІ Ў МУДРАСЦЬ УНІВЕРСІТЭЦКІХ АЎДЫТОРЫЙ

БЫЎ ЧЭРВЕНЬ 1921 года. У невялікім пакоі былой гімназіі сабраліся рабфакаўцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта на свой першы камсамольскі сход. Яны яшчэ не паспелі пазнаёміцца, таму што толькі прыехалі ў Мінск з розных куткоў Беларусі. Рабочыя, сяляне, дэмабілізаваныя з Чырвонай Арміі салдаты прыйшлі вучыцца ў толькі што адкрыты універсітэт.

Кожнага камсамольца, іх было не больш 20 чалавек, апаноўвалі свае думы, хвалявала незвычайнасць абставін. Яны прыглядаліся адзін да аднаго, упаўголаса перагаворваліся. Чакалі прадстаўніка рэктарата, каб адкрыць камсамольскі сход рабфака, абмеркаваць задачы камсамола першай вышэйшай навучальнай установы рэспублікі.

Задачы стаялі складаныя і цяжкія. Усё неабходна было пачынаць без малейшага вопыту камсамольскай работы на рабфаку. Не ўсе камсамольцы разумелі да канца, што такое рабочы факультэт, што будзе ўяўляць сабой Беларускі дзяржаўны універсітэт. Аднак новае жыццё Савецкай краіны захапіла кожнага рабфакаўца. З гарачынёй і энергіяй, верай і надзеяй, якімі яны ваявалі на франтах рэвалюцыі, працавалі каля станкоў і за плугам, яны, рабфакаўцы, былі гатовы прыняцца за вучобу, нягледзячы ні на якія цяжкасці.

У чэрвені 1921 года на рабфак было залічана 160 чалавек. Па агульнаадукацыйнаму ўзроўню, узросту, нацыянальнаму і сацыяльнаму саставу, палітычнай адукацыі гэта былі розныя людзі, якіх з'яднала вялікае жаданне вучыцца.

У выніку дадатковага восеньскага набору на рабфак было залічана яшчэ 125 чалавек. Агульная колькасць навучэнцаў рабфака склала 285 чалавек, сярод іх было 25 камсамольцаў.

Камсамольская ячэйка наладзіла дзелавыя кантакты з кіраўніцтвам рабфака, камуністамі універсітэта, паслала дэлегатаў у органы самакіравання.

Такім чынам, да пачатку заняткаў ва універсітэце камсамольская ячэйка разгарнула актыўную работу, якая па ўспамінах аднага з камсамольцаў тых гадоў атрымала прызнанне ўсіх навучэнцаў рабфака.

30 кастрычніка 1921 года, калі адбыўся ўрачысты пачатак заняткаў у БДУ, у партыйную, камсамольскую арганізацыі універсітэта ўлілося значнае папаўненне. На трох факультэтах: рабочым, грамадскіх навук і медыцынскім сярод агульнай колькасці 1705 студэнтаў было 198 членаў партыі, 12 кандыдатаў і 44 камсамольцы.

На ўсіх факультэтах былі створаны камсамольскія ячэйкі, закліканыя стаць цэнтрам ідэйна-палітычнай работы сярод студэнтаў.

Першы агульнаўніверсітэцкі камсамольскі сход адбыўся 1 студзеня 1922 года. К гэтаму часу на рабфаку налічвалася 26 членаў КСМ, медыцынскім — 7, педагагічным — 4, грамадскіх навук — 3 камсамольцы. Такім чынам, 40 камсамольцаў стварылі першую камсамольскую арганізацыю вышэйшай навучальнай установы рэспублікі. Першы агульнаўніверсітэцкі камсамольскі сход — знамянальная падзея ў жыцці ўсяго студэнцтва.

Стварэнне агульнаўніверсітэцкай ячэйкі адразу актывізавала грамадскае жыццё студэнцтва, аб'яднала і падначаліла сілы адзіным мэтам. 19 лютага 1922 года ва універсітэце адбыўся першы масавы нядзельнік, у якім удзельнічалі ўсе камуністы і камсамольцы.

Значную ўвагу камсамольская арганізацыя універсітэта удзяляла вучэбнаму працэсу. Камсамольцы разам з выкладчыкамі абмяркоўвалі вучэбныя планы і праграмы, вялі дыскусіі аб неабходнасці таго ці іншага курса, імкнуліся выхаваць у сабе арганічную неабходнасць спасцігнення таямніц навукі. Адзін з выкладчыкаў універсітэта адзначаў, што ў справе арганізацыі вучобы студэнтаў «у наяўнасці ёсць ужо галоўнае — гэта агульная свядомасць, што ў сценах яго ствараецца сур'ёзная аснова прыцягнення да навукі шырокіх слаёў працоўнага і сялянскага насельніцтва, якім упершыню адкрыта дарога да святла і ведаў».

Камсамольская ячэйка паступова заваёўвала аўтарытэт, стала авангардам пралетарскай часткі студэнцтва, вяла за сабой асноўную масу моладзі універсітэта розных палітычных поглядаў.

Ужо ў першыя гады работы універсітэт стаў цэнтрам навукі і культуры. Да ведаў цягнулася ўся моладзь Савецкай Беларусі, ва універсітэце выраслі партыйныя і дзяржаўныя дзеячы, вучыліся вядомыя пісьменнікі і паэты. Ва універсітэце працаваў народны паэт Беларусі Якуб Колас.

У ліку першых студэнтаў універсітэта былі буйнейшыя прадстаўнікі беларускай літаратуры Паўлюк Трус, Кандрат Крапіва і Кузьма Чорны. У 1924 годзе ва універсітэцкай газеце «Голас студэнта» быў надрукаваны фельетон К. Чорнага «Адсталыя і перадавыя».

Ва універсітэце вучыліся і выраслі празаікі і паэты — П. Броўка, А. Александровіч, А. Дудар, М. Зарэцкі, А. Звонак, А. Якімовіч, Я. Скрыган, М. Лужанін і іншыя. Вучоба ва універсітэце садзейнічала фарміраванню творчай індывідуальнасці празаікаў і паэтаў, зближала не толькі са студэнцтвам, але і з усёй моладдзю рэспублікі. Яны былі ўдзельнікамі розных масавых мерапрыемстваў, якія праводзіла камсамольская арганізацыя універсітэта, тым больш, што многія са студэнтаў - літаратараў мелі значны жыццёвы і камсамольскі вопыт. Вядомы паэт А. Александровіч рэдагаваў часопіс «Маладыя араты», А. Якімовіч — «Беларускі піянер».

20 лютага 1925 года ва універсітэце адбыўся першы выпуск спецыялістаў. З 432 чалавек, прынятых у 1921 годзе на факультэт грамадскіх прафесій, скончыла універсітэт 60 чалавек.

З 1925 года ў дзейнасці універсітэцкага камсамола пачынаецца новы этап. Камсамольская арганізацыя вырасла, умацавала свае рады ідэйна і арганізацыйна. Яна стала цэнтрам культурна-масавай работы, неад'емнай часткай жыцця гарадской камсамольскай арганізацыі. Камсамол універсітэта першым адгукаўся і падтрымліваў усе масавыя, культурныя і гаспадарчыя мерапрыемствы ЛКСМБ.

Актыўную і шматгранную работу вяла камсамольская арганізацыя універсітэта па падрыхтоўцы дастойнай сустрэчы 10-годдзя Вялікага Кастрычніка. На агульнаўніверсітэцкім сходзе быў распрацаваны план мерапрыемстваў, які потым абмяркоўваўся на факультэцкіх і курсавых сходах. У насценных газетах былі заведзены аддзелы «Падрыхтоўка да Кастрычніка». Пры кабінеце марксізму-ленінізму адкрыўся аддзел Кастрычніцкай рэвалюцыі, выпускаўся рукапісны часопіс, прысвечаны дасягненням універсітэта.

У юбілейным годзе ўдасканальвалася навукова-даследчая работа, якая усё больш прыцягвала студэнтаў. Яны распрацоўвалі праблемы дрэваапрацоўчай, папяровай, бульбаапрацоўчай, запалкавай, тарфяной прамысловасці.

З 1928 па 1931 гады вялося будаўніцтва універсітэцкага гарадка. Разам з будаўнікамі на ўзвядзенні універсітэцкіх будынкаў працавалі і студэнты. Па ініцыятыве партыйнай і камсамольскай арганізацый на будоўлях праводзіліся масавыя нядзельнікі.

Актыўная грамадска-палітычная дзейнасць камсамольскай арганізацыі універсітэта давала свой плён. З кожным годам усё большая колькасць студэнтаў станавілася членамі ЛКСМБ. Да 10-й гадавіны БДУ кожны чацвёрты студэнт быў камсамольцам. У 1928 годзе універсітэцкая камсамольская арганізацыя налічвала 600 членаў, у 1930 годзе ўжо 740.

За дзесяць год камсамольская арганізацыя назапасіла вялікі вопыт вучэбнай, палітыка-выхаваўчай работы, загартавалася ў барацьбе з дробнабуржуазнымі элементамі. У цэнтры ўвагі была праблема падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, якія валодаюць высокім узроўнем тэарэтычнай падрыхтоўкі, маюць трывалыя практычныя навыкі, а таксама высокую марксісцка-ленінскую свядомасць.

Для дасягнення гэтай мэты ў арсенале камсамольскай арганізацыі меліся розныя формы і метады работы. Камсамольцы дапамагалі адстаючым у вучобе, уздзейнічалі на нядбайных, не дапускалі праяў амаралізму, змагаліся з мяшчанскім уплывам. Сталі аўтарытэтнымі камсамольскія сходы ў пярвічных арганізацыях. На іх абмяркоўваліся пытанні вучобы, быту, адпачынку, паводзіны студэнтаў.

Камсамольская арганізацыя універсітэта за дзесяць год існавання зарэкамендавала сябе баявым атрадам ЛКСМБ.

**А. СЛУКА,**
**дацэнт, сакратар камітэта камсамола БДУ (1971—1973 гг.)**

## З нашай пошты

# БРАЦКАЯ ДАПАМОГА

ШЧЫРАСЦЬ і клопат савецкіх людзей адчувае кожны, хто прыязджае ў Савецкі Саюз. Я зразумеў гэта вельмі добра цяпер, у час вучобы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Ужо трэці год я знаходжуся далёка ад радзімы, але Савецкая краіна стала мне сапраўды другім домам.

Спачатку было шмат цяжкасцей, і я не верыў, што буду ведаць рускую мову. Але дзякуючы дапамозе выкладчыкаў, савецкіх сяброў зараз я свабодна размаўляю па-руску. У мяне паявілася шмат добрых знаёмых, таварышаў, якія заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу.

**ГАЛАЛЬ САІД САМАН,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

# МАЦНЕЕ ДРУЖБА

**26 СТУДЗЕНЯ** індыйскі народ адзначае сваё свята. Трыццаць адзін год назад, у 1950 годзе, наш народ прыняў канстытуцыю незалежнасці Рэспублікі Індыі. З таго часу гэты студзеньскі дзень адзначаецца як Дзень рэспублікі.

У СССР я прыехаў у 1976 годзе з Калькуцкага універсітэта. За два з лішнім гады я пазнаёміўся з жыццём савецкага народа, з культурай і звычаямі розных народаў СССР. Гады, праведзеныя на радзіме Леніна, на ўсё жыццё застануцца ў маёй памяці.

У Дзень рэспублікі мы ўспамінаем брацкую падтрымку Савецкага Саюза Індыі. Дружба паміж двума вялікімі народамі пастаянна ўмацоўваецца. Пры садзейнічанні Савецкага Саюза на маёй радзіме пабудаваны прадпрыемствы чорнай і каляровай металургіі, вугальнай і нафтавай прамысловасці, энергетыкі і машынабудавання. У Індыі высока цэняць уклад СССР у развіццё яе нацыянальнай эканомікі. Супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі працягвае паспяхова развівацца. За мінуўшыя 10 год гандлёвы абарот паміж нашымі краінамі павялічыўся ў чатыры разы.

Прыкметнай падзеяй у галіне навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва з'явіліся запускі пры садзейнічанні Савецкага Саюза першага індыйскага штучнага спадарожніка Зямлі.

Сустрэча кіраўнікоў нашых дзяржаў на вышэйшым узроўні, якая адбылася ў снежні 1980 года, яшчэ больш будзе садзейнічаць развіццю брацкіх сувязей паміж нашымі краінамі.

**НАХАР ПРАДЗІП,**
**аспірант хімфака (Індыя).**

# Справы зямляцтва

АКТЫЎНА працуе, арганізоўвае шмат цікавых мерапрыемстваў студэнцкае зямляцтва Туніса, у якое ўваходзяць і студэнты БДУ. Гэта і сходы, на якіх абмяркоўваюцца пытанні вучобы туніскіх студэнтаў, палітінфармацыі і лекцыі, спартыўныя спаборніцтвы з іншымі зямляцтвамі, экскурсіі і культпаходы.

Вялікую дапамогу ў рабоце аказваюць нам савецкія сябры: садзейнічаюць у арганізацыі карысных сустрэч, вечароў, запрашаюць на свае сходы і вечары адпачынку.

**УЕСЛАЦІ АБІБ,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**



Перад выпрабаваннем.

Фотаэцюд М. Дубовіка.

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

# ПАД ГУКІ ФАНФАР



УПЕРШЫНЮ пасля пяцігадовага перапынку было праведзена зімовае першынство БДУ па лёгкай атлетыцы. У ім прыняло ўдзел 379 чалавек — прадстаўнікоў адзінаццаці факультэтаў.

Лепшы вынік у забегу дзяўчат на дыстанцыю 60 метраў належыць студэнтцы хімічнага факультэта Ірыне Чурсіной—7,6 секунды. 200 метраў яна прабегла за 27,3 секунды, што зноў дазволіла ёй заняць першае месца і замацаваць за сабой званне мацнейшага спрынтэра універсітэта. Сярод юнакоў на шасцідзесяціметроўцы з вынікам 6,8 секунды перамог студэнт біялагічнага факультэта Сяргей Гілевіч. Хочацца таксама адзначыць і поспех С. Заланцэвіча (мехмат), які заваяваў «золата» ў скачках у даўжыню — 6 метраў 89 сантыметраў.

У камандным першынстве месцы паміж факультэтамі размеркаваліся наступным чынам (у дужках — колькасць набраных ачкоў):

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Механіка-матэматычны | 378,5 |
| 2. | ФПМ | 229,0 |
| 3. | Фізічны | 218,5 |
| 4. | Гістарычны | 216,5 |
| 5. | Юрыдычны | 176,0 |
| 6. | Радыёфізічны | 164,0 |
| 7. | Філалагічны | 107,0 |
| 8. | Хімічны | 88,5 |
| 9. | Біялагічны | 80,0 |
| 10. | Геаграфічны | 64,0 |
| 11. | Журналістыкі | 53,0 |

Прыемнай нечаканасцю стала выступленне зборнай каманды філалагічнага факультэта. І хоць вынік невысокі — сёмае месца,— але ў параўнанні з мінулым годам гэта значны крок наперад.

Між іншым, калі супаставіць некаторыя лічбы, можна заўважыць пэўную залежнасць паміж колькасцю ўдзельнікаў ад кожнага факультэта і занятым месцам. Напрыклад, пераможца —зборная каманда мехмата налічвала 56 удзельнікаў, зборная ФПМ, якая заняла другое месца, была прадстаўлена 39 спартсменамі. А каманды геаграфічнага факультэта і журфака, якія апынуліся ў канцы табліцы, выставілі толькі па 18 удзельнікаў. Лічбы гавораць самі за сябе.

Нельга не адзначыць якаснае судзейства А. В. Цітова, Э. В. Тарноўскага і іншых. У складаных умовах яны змаглі добра правесці спаборніцтвы, без ніводнага наракання.

Я невыпадкова сказаў пра складаныя ўмовы. Спаборніцтвы праходзілі ў памяшканні манежа «Дынама», які арандуе універсітэт, і ў час, адведзены для трэніровак універсітэцкіх спартсменаў. А ён, на жаль, быў вельмі сціслы, што прывяло да значнага ўскладнення правядзення спаборніцтваў. У сувязі з гэтым, напрыклад, не адбыўся парад удзельнікаў, які планавалася правесці. Гэта, безумоўна, не дробязь. У спорце іх няма і быць не можа. Аб гэтым трэба думаць заўсёды і ўсім, і асабліва арганізатарам спаборніцтваў.

**У. БЯЛОЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

**НА ЗДЫМКАХ: імгненні спаборніцтваў.**

Фота **аўтара.**





**Крыху перадышкі, і хутка зноў у бой.**

Фота **Б. Гапонава.**

# «СУХІ ЛІСТ»

**(ГУМАРЭСКА)**

УСЁ ПАЧАЛОСЯ з нашага захаплення футболам. Нам надакучыла без справы гойсаць па вуліцы, і, нарэшце, мы вырашылі зрабіць футбольнае поле на пустыры, дзе стаяла невялікая хата бабулі Фядулы. Яна не любіла спорт наогул, а футбол у прыватнасці. Кожны раз, як толькі пачыналіся нашы футбольныя баталіі, Фядула выходзіла з віламі на баявое дзяжурства каля вокнаў сваёй хаты і цярпліва чакала. На шчасце, нашы слабыя ўдары не дасягалі межаў яе ўладання, і таму ўсё лета абодва бакі не даходзілі да прамой сутычкі.

Прыйшла восень. Да нас у вёску прыехалі студэнты на бульбу. Амаль усе яны абыякава адносіліся да футбола. Толькі адзін з іх, шыракаплечы Валодзя Цецерукоў лічыў сябе вялікім майстрам.

Па асабістай ініцыятыве ён стаў нашым «трэнерам».

І тут пачалося. На першых занятках ён прымусіў нас развучваць удар «сухі ліст».

— «Сухі ліст»,— тлумачыў Цецерукоў,— гэта такі ўдар, пасля якога мяч ляціць спачатку па прамой, а потым рэзка мяняе свой напрамак. Пакажаю!

Ён устанавіў мяч на адлегласці 11 метраў ад варот, разагнаўся і моцна ўдарыў...

«Тракх! Дзінь-дзінь!!» — жалобна зазвінела акно ў бабулі Фядулы. Удар быў настолькі нечаканым, што гаспадыня не паспела нават зварухнуцца.

— Забойцы! — залемантавала старая і кінулася з віламі да мяча. Некалькі рухаў — і мяч зашыпеў, выпускаючы ў блакітнае неба сваю футбольную душу. На гэтым і закончыўся наш першы ўрок.

Назаўтра ўся каманда пачала чарговую гульню. Аднак радасць была нядоўгай: паявіўся Валодзя Цецерукоў і рашуча сказаў:

— Заканчвайце! Прадоўжым учарашнія заняткі.

Ён сабраў нас ля варот, пастроіў і запытаў:

— Што такое ўдар «сухі ліст»? Вось ты, адказвай!

Другакласнік Мішка Барысікаў, наш цэнтральны нападаючы, зрабіў крок наперад:

«Шухі лішт» — гэта калі дзядзя Валодзя б'е па варотах, а пападае ў акно бабулі Фядулы.

— А цяпер,—працягваў «настаўнік»,— я вам яшчэ раз пакажу, што такое «сухі ліст».

Удар!!! Сямікілаграмовае чыгуннае ядро павольна пракацілася метраў пяць па мураве і замерла. Дзікі роў страсянуў паветра і плаўна перайшоў у якатанне. Мы бачылі, як «трэнер» енчыў і абдымаў сваю правую, лепшую нагу універсітэцкай зборнай.

Больш мы Валодзю не бачылі. Ходзяць чуткі, што пасля гэтага выпадку ён назаўсёды пакінуў вялікі спорт і перайшоў у лагер прыхільнікаў бабулі Фядулы.

**У. КАПСКІ.**

# РЭКОРДЫ УНІВЕРСІТЭЦКІХ СПАРТСМЕНАЎ ПА ЛЁГКАЙ АТЛЕТЫЦЫ

**МУЖЧЫНЫ**

| Дыстанцыя | | | |
|---|---|---|---|
| 100 м | Б. Лютарэвіч | 10,4 | 1975 |
| 200 м | Б. Лютарэвіч | 20,9 | 1974 |
| 400 м | А. Башаркевіч | 47,4 | 1979 |
| 800 м | М. Базылеў | 1.54,5 | 1963 |
| 1500 м | М. Базылеў | 3.54,2 | 1961 |
| 3000 м | В. Шпігаў | 8.24,0 | 1973 |
| 5000 м | В. Шпігаў | 14.27,0 | 1970 |
| 10000 м | В. Шпігаў | 29.59,8 | 1970 |
| 110 м з/б | В. Грыбкоўскі | 14,8 | 1978 |
| 400 м з/б | А. Якубеня | 55,7 | 1978 |
| 3000 м з/б | В. Шпігаў | 9.03,0 | 1971 |
| Даўжыня | В. Кузьменка | 7,88 | 1972 |
| Вышыня | А. Шкарупа | 2,05 | 1974 |
| Шэст | Ю. Глыбоўскі | 5,00 | 1973 |
| Ядро | І. Чурыла | 17,90 | 1978 |
| Дыск | В. Гутар | 55,74 | 1972 |
| Молат | А. Міхнавец | 70,78 | 1975 |
| 20 км с/х | А. Семяновіч | 1:28,30 | 1980 |
| трайны | У. Гараеў | 16,63 | 1960 |
| кап'ё | У. Сіўцоў | 58,95 | 1957 |
| 10-бор'е | А. Якаўлеў | 7454 | 1974 |

**ЖАНЧЫНЫ**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 100 м | Т. Надзеева | 11,5 | 1972 |
| 200 м | Л. Рунцо | 23,9 | 1975 |
| 400 м | Л. Рунцо | 53,9 | 1975 |
| 800 м | Л. Рунцо | 2.09,3 | 1975 |
| 100 м з/б | В. Сотнікава | 14,4 | 1975 |
| 400 м з/б | В. Склярава | 1.03,6 | 1976 |
| 1500 м | М. Церахава | 2.15,6 | 1975 |
| 3000 м | В. Жукоўская | 10.48,2 | 1978 |
| Даўжыня | Л. Кайгародава | 6,60 | 1976 |
| Вышыня | Т. Бойка-Шляхто | 1,90 | 1976 |
| Ядро | М. Войтава | 14,90 | 1978 |
| Дыск | М. Войтава | 58,30 | 1978 |
| Кап'ё | М. Верамейчык | 50,50 | 1960 |
| 5-бор'е | В. Сотнікава | 3982 | 1974 |

ФАКТ З КАМЕНТАРЫЕМ

**АД РЭДАКЦЫІ. Рэкорды ўзяты па стану на 1-е студзеня 1981 года. Зауважце, паважаныя чытачы, што некаторыя з рэкордаў па лёгкай атлетыцы, як кажуць, «з барадою». Напрыклад, у мужчын рэкордам на дыстанцыю 800 і 1500 метраў сёлета споўніцца адпаведна 18 і 20 год. А рэкорду ў кіданні кап'я — 24. Не адстае па «ўзросту» і рэкорд у трайным скачку — 20 год. Віншуем кафедру фізічнага выхавання і спорту з гэтымі «юбілеямі!»**

# ЭКСПРЭС-ІНФАРМАЦЫЯ

**● МІНІ-ФУТБОЛ ●**

ТУРНІРЫ па гэтаму цікаваму віду спорту сталі ва універсітэце ўжо традыцыяй. Сёлетні, чацвёрты па ліку турнір быў праведзены па ініцыятыве зямляцтва балгарскіх студэнтаў. У турніры прынялі ўдзел таксама студэнты з ГДР, Алжыра, В'етнама і Мадагаскара. Чэмпіёнам стала каманда футбалістаў ГДР, якой быў уручаны пераходны кубак і дыплом першай ступені. Другое месца занялі алжырскія спартсмены.

У ходзе турніра адабраны кандыдаты ў зборную каманду універсітэта, якая ў хуткім часе пачне падрыхтоўку да гарадской спартакіяды замежных студэнтаў.

**А. ЯФІМАЎ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

Закончыліся спаборніцтвы па наступных відах спорту:

**● БАСКЕТБОЛ ●**

(У дужках — колькасць набраных ачкоў)

**Мужчыны.**

1. **Мехмат (180)**
2. **Фізфак (150)**
3. **ФПМ (120)**
4. **Радыёфізікі і электронікі (90)**
5. **Гістфак (80)**
6. **Юрфак (80)**
7. **Біяфак (70)**
8. **Геафак (60)**
9. **Хімфак (50)**
10. **Філфак (40)**

Каманда факультэта журналістыкі ў спаборніцтвах не ўдзельнічала.

**● ВАЛЕЙБОЛ ●**

**Мужчыны.**

1. **Радыёфізікі і электронікі (180)**
2. **Гістфак (150)**
3. **Мехмат (120)**
4. **Фізфак (90)**
5. **Хімфак (80)**
6. **Біяфак (80)**
7. **Геафак (70)**
8. **ФПМ (60)**
9. **Юрфак (50)**
10. **Філфак (40)**
11. **Журфак (30)**

**Жанчыны.**

1. **ФПМ (180)**
2. **Гістфак (120)**
3. **Мехмат (120)**
4. **Фізфак (90)**
5. **Хімфак (80)**
6. **Юрфак (80)**
7. **Біяфак (70)**
8. **Філфак (60)**
9. **Радыёфізікі і электронікі (50)**
10. **Журфак (40)**
11. **Геафак (30)**

**● ШАШКІ ●**

1. **Фізфак (180)**
2. **ФПМ (150)**
3. **Хімфак (120)**
4. **Мехмат (90)**
5. **Радыёфізікі і электронікі (80)**
6. **Юрфак (70)**
7. **Філфак (60)**
8. **Журфак (50)**
9. **Гістфак (40)**

Каманды геаграфічнага і біялагічнага факультэтаў зняты з турніра за парушэнне ўмоў спаборніцтваў.



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

22 студзеня 1981 г.

АТ 02041 Заказ 154.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ